**І. М. Грамовіч,**
*кандыдат педагагічных навук,*
*дацэнт кафедры беларускай*
*народнапесеннай творчасці*
*БДУ культуры і мастацтваў*

# ШКОЛА НАРОДНЫХ СПЕВАЎ: СУЧАСНЫ СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

Кожны чалавек з дастаткова развітым музыкальным пачуццём можа спяваць. Аднак спевы могуць быць вельмі рознымі як па прыгажосці і сіле гуку, так і па моцы ўздзеяння, г. зн. па іх выразнасці [1, с. 72]. У гэтым практычна заключаецца сутнасць мастацтва спеваў. Перш-наперш, каб пачаць вучыцца спевам, неабходна асэнсаваць і ўдакладніць у практычным аспекце, што такое спевы. Валоданне добрым голасам і музыкальнымі здольнасцямі не дае гарантыю поспеху ў майстэрстве спеваў. Па-сапраўднаму добра спяваць можа не кожны, за гэтым стаіць упартая і адказная праца.

Народная манера выканання характарызуецца не толькі спосабам і спецыфікай спеваў, але і пэўнымі творчымі ўстаноўкамі, якія ўплываюць на маральнае і эстэтычнае выхаванне выканаўцы народнай песні. Натуральная прырода народных спеваў спрыяе духоўнаму развіццю асобы і фарміруе інтарэс да народнапесеннага мастацтва. Прастата і даступнасць народнай песні дазваляюць дакрануцца да крынічнай чысціні зносін з цудоўным. Дзякуючы школе народных спеваў мы маем магчымасць сфарміраваць вобразнае мастацкае мысленне, а таксама раскрыць творчы патэнцыял спевака.

Беларусь – рэгіён самабытнай старажытнай культуры, дзе народнапесенныя традыцыі распаўсюджаны і захаваліся да нашага часу. Праблема захавання, навучання і папулярызацыі народных спеваў не губляе сваёй актуальнасці ў наш час. Стварэнне школы народных спеваў, прафесійная падрыхтоўка спецыялістаў – складаная педагагічная задача сучасных музычных навучальных устаноў.

Народнапесенная адукацыя ў Беларусі бярэ пачатак з 1978 г., але толькі ў 1999 г. была адкрыта спецыялізацыя “спевы (народныя)” па падрыхтоўцы выканаўцаў народнай песні. У сучаснай педагагічнай практыцы мы маем вельмі разнастайны склад

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абітурыентаў з рознымі вакальнымі данымі, рознай вакальнай падрыхтоўкай і культурай выканання. Недахопы вакальнай падрыхтоўкі выяўляюцца як у вакальна-тэхнічных адносінах, так і творча-мастацкіх: заціснуты, ці насавы гук, крыклівыя спевы, увогуле адсутнасць культуры выканання. Падрыхтоўка спецыяліста-спевака патрабуе працяглай працы, індывідуальных заняткаў, якія прадугледжваюць ліквідацыю гэтых недахопаў, што больш складана, чым навучанне з "чыстай паперы". Студэнт павінен прывыкнуць да новых уяўленняў, прыняць новыя патрабаванні і метады навучання. Толькі паступовыя і цярплівыя тлумачэнні, выпраўленне памылак і дакладнае пераадоленне цяжкасцей дапамогуць знайсці ўзаемаразуменне і стварыць трывалы саюз выкладчыка і студэнта.

Як вядома, талент развіваецца і фарміруецца толькі ва ўмовах, калі існуе цэласны і комплексны навучальны працэс, дзе ўсе вывучаемыя прадметы, такія як пастаноўка голасу, вакальны ансамбль, акцёрскае майстэрства і харэаграфія, актывізуюць творчы патэнцыял спевака і пабуджаюць да актыўнай творчай дзейнасці, выключаючы пасіўнае ўспрыманне ведаў.

На сучасным этапе застаецца спрэчным пытанне аб эталоне гучання народнага голасу. Вельмі добра, калі маладыя людзі ўлюбляюцца ў аўтэнтычныя спевы. Яны па-свойму прыгожыя сваёй натуральнасцю, чысцінёй спеўнага стылю, непасрэднасцю і пранікнёнасцю ў песню, прыцягваюць сваёй праўдзівасцю, гістарычнай памяццю, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне. У захаванні такой песеннай спадчыны вялікая роля надаецца той акалічнасці, што носьбіты традыцый выраслі і жывуць у натуральным асяроддзі, адкуль родам іх песні. Сучасная моладзь не можа дастаткова поўна акунуцца ў гэтае асяроддзе. Сляпое капіраванне спеваў сталых вясковых спевакоў не заўсёды прыводзіць да пераймання традыцыі. Напрыклад, у аўтэнтычных спевах ужываецца рэдукаваная падмена галосных, якімі карыстаюцца вясковыя спевакі для зручнасці спеваў. Іх не хвалюе тое пытанне, што парушаецца дыкцыя і словы будуць не зразумелыя; вяскоўцы ведаюць гэтыя словы напамяць. У маладых гарадскіх спевакоў рэдукаванне гучыць ненатуральна і няўмела.

Існуючыя бытавая (аўтэнтычная) і стылізаваная (акадэмізаваная) манеры выканання маюць розны каларыт гучання, але аднолькавую прыроду гукаўтварэння. Магчыма навучыцца дакладна пераняць майстэрства аўтэнтычных спеваў, але пасля

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таго, як спявак засвоіў сапраўдную вакальную тэхніку народнай манеры, што ўключае правільны спосаб гукаўтварэння, тэхніку дыхання, механізм вымаўлення галосных, зычных і інш.

Пошукі шляхоў навучання ў народнай манеры прымусілі звярнуцца да шматлікіх даследаванняў у сферы вакальнай педагогікі і фальклору. Гэта працы В.Апраксінай, Л.Дзмітрыева, А.Менабені, Н.Калугінай, В.Шамінай, Н.К.Мяшко. Вялікую каштоўнасць для нас маюць працы Н.К.Мяшко, якая стварыла методыку навучання народным спевам і выхавала шмат выканаўцаў народнай песні. Канчатковую мэту артыста-спевака ў мастацтве спеваў яна бачыць у "стварэнні асабістага творчага твару" са сваім вобразным бачаннем і творчай сілай увасаблення.

Пад паняццем "школа народных спеваў" разумеецца авалодванне тэхнікай і майстэрствам народнай манеры выканання. Мастацтва выканання народнай песні трымаецца на некаторых правілах галоўнага метаду – на ўстойлівым і дынамічным грудабрушным гукавядзенні, на эластычнай дыяфрагмальнай апоры [2, с. 40]. Праблемы выпрацоўкі правільнага дыхання, расходаванне яго пастаянна цікавяць вучня. Як паказвае практыка, студэнту вельмі цяжка захоўваць гэтыя правілы, асабліва пры спевах на *piano*. Губляючы апору дыхання, ён губляе і апору гуку, адсюль спевы атрымліваюцца невыразныя. Акрамя таго, вялікую ролю мае дакладная і выразная інтанацыйна-сэнсавая атака гуку. Гэта, можна сказаць, залатое правіла, без якога немагчыма лёгкае, блізкае і палётнае гукаўтварэнне. Спевы "на купале", рэгуляцыя высокай пазіцыі гуку шляхам падняцця мяккага паднябення вядуць да якаснага і правільнага гукаўтварэння. І, нарэшце, яшчэ адно правіла. Гэта асэнсаваны і дакладны распеў слоў на гукапатоку, з накіраванай увагай на размоўна-адкрыты распеў галосных. Добрае вымаўленне, дакладная дыкцыя пры свабоднай артыкуляцыі – галоўная ўмова для эфектыўнага выканання гэтага правіла. Выкарыстанне і выкананне гэтых трох складаючых станоўча ўплываюць на навучальны працэс па развіцці вакальнай тэхнікі.

На кафедры народнапесеннай творчасці Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў знаёмства са спецыфічнымі асаблівасцямі жанраў беларускай народнай песні і рэгіянальных гаворак, вывучэнне ўмоў бытавання традыцый народных спеваў дапамагаюць знайсці шляхі ў навучанні майстэрству народнай манеры выканання. Спалучаючы класічныя метады навучання з традыцыйнымі прыёмамі і спосабамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выканання народнай песні, выкладчыкі ўдасканальваюць кірункі навучання. У класе па пастаноўцы голасу абавязкова вывучаецца жанравая разнастайнасць беларускай народнай песні, якая патрабуе працы над асаблівасцямі гукаўтварэння і эмацыянальнай падачы гуку. Вясеннія загуканні, жніўныя песні, купальскія песні магічнага характару патрабуюць шырокага, моцнага гучання на моцнай апоры дыхання і гуку. Карагодныя і лірычная песні, песні-балады, любоўныя і сіроцкія песні выконваюцца з іншым эмацыянальным настроем, мякка, нягучна, плаўна і спакойна.

Майстэрства спеваў і манера выканання непасрэдна звязаны з асаблівасцямі рэгіянальнай мовы. Мы прытрымліваемся ўвогуле прыроды народных спеваў, якая, як вядома, непасрэдна звязана з жывой народнай мовай. Менавіта ад моўных інтанацый ідуць характэрныя прыгукі, слізганні, спады і ўздымы голасу, народныя мелізмы і іншыя галасавыя ўпрыгажэнні. Моцнасць уздзеяння спеўнай мовы ў тых сэнсавых адценнях, якімі павінен карыстацца сапраўдны спявак, дапамагае авалодаць майстэрствам перадачы сэнсу выконваемага твора. Вывучаючы тэкст народнай песні, мы ўжо адчуваем музычную стужку ў паэтычным тэксце, пластыку мовы. Слова – гэта абазначэнне нейкага дзеяння, рэчаў, паводзін, абставін, інакш кажучы, таго, што сустракаецца ў рэальным жыцці чалавека. Любое слова набывае markedнае значэнне ў залежнасці ад інтанацыі, з якой яно будзе вымаўлена. Правільнае вымаўленне, набыццё ведаў па фарміраванні і асаблівасцях фарміравання галосных і зычных гукаў у спевах, выпрацоўка моўнай інтанацыйнай выразнасці спеваў – адзін з галоўных этапаў навучання.

Сапраўды, школа спеваў – гэта не проста перадача вывучанага меладычнага малюнку, а жывая, натуральная і трапяткая музычная думка, мноства эмоцый, якія нараджаюцца ў спевака і перадаюцца слухачам. У сучаснай практыцы вышэйшых навучальных устаноў выкладчык імкнецца навучыць будучага выканаўцу “ствараць” песню. На занятках па пастаноўцы голасу вядзецца праца менавіта па развіцці і перадачы эмацыянальных перажыванняў, якія закладзены ў песенным матэрыяле. Як зрабіць, каб разам з тэхнічнымі задачамі актыўна развівалася творчая асоба? Пераадоленне вакальных цяжкасцей і абыякавая падача гуку не могуць прынесці асалоду ні слухачам, ні самому выканаўцу. Найбольшую каштоўнасць спевы набываюць у тым выпадку, калі спявак выкарыстоўвае творчы падыход да выконваемага твора,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інтанацыйную выразнасць, багацце тэмбравых адценняў, акцёрскае майстэрства. Неабходна пастаянна шукаць новыя сэнсавыя інтанацыі і ўдасканальваць сваё майстэрства. Працуючы ў класе, выконваючы песню на канцэрце ці іспытах, патрэбна выкарыстоўваць новыя тэмбральныя адценні, уключаць у працу рэзанатары, удасканальваць спевы на апоры дыхання. Эмацыянальную сферу выканання народнай песні неабходна дапоўніць рухамі, жэстамі, мімікай. Гэтыя дзеянні звычайна спалучаюцца з ідэйным сэнсам выконваемага твора, дапамагаць стварэнню сцэнічнага мастацкага вобраза народнай песні.

Вельмі важным у працэсе авалодвання народнай манерай мы лічым выпрацоўку свядомых і крытычных адносін да сваіх спеваў. Свядомае і актыўнае разуменнне пастаўленай задачы, сумесныя намаганні па стварэнні мастацкага вобраза і пераадоленні тэхнічных цяжкасцей ствараюць атмасферу агульнай справы і ажыццяўляюць супрацоўніцтва выкладчыка і студэнта-спевака. У вакальнай працы мы прытрымліваемся наступных кірункаў:

1) развіццё голасу ад прымарных тонаў з паступовым пашырэннем дыяпазону;

2) вуснае тлумачэнне і спевы з голасу выкладчыка, агульнае вызначэнне лепшага гучання, дасягненне пастаўленай мэты;

3) сістэматычная і паслядоўная праца над голасам, паступовае пераадоленне вакальных цяжкасцей;

4) праца над развіццём вакальнага слыху і агульным развіццём музыкальнасці;

5) авалодванне бытавой і стылізаванай манерамі выканання;

6) ужыванне ў вучэбным працэсе разнастайнага рэпертуару.

Стварэнне школы народных спеваў і новых методык прафесійнага навучання выканаўцаў народнай песні вызначаюць галоўную стратэгічную задачу выхавання самабытнага, высокапрафесійнага і шырокаадукаванага спецыяліста.

---

1. *Дмитриев, Л.Б.* Основы вокальной методики / Л.Б.Дмитриев. – М.: Музыка. – С. 72.

2. *Мешко, Н.К.* Искусство народного пения / Н.К.Мешко // Практическое руководство и методика обучения искусству народного пения / Н.К.Мешко. – М., 2000. – Ч. 2.– С. 14.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ